# БІБЛІЯТЭКІ

За 15 лістапада чытальні дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя Леніна наведала 1055 чытачоў. Кніг было выдана 1931. У агульнай чытальні працавала над кнігамі 807 чалавек.

У чытальні рабочых-стаханаўцаў маладыя рабочы-стаханавец, слесар завода «Чырвоны металіст» т. Грэк працуе над тэмай з палітэканоміі «Зямельная рэнта». Ён рыхтуецца самаадукацыяй у ВНУ. Рабочы фабрыкі «Кастрычнік» т. Фельдман вывучае нямецкую мову. Рабочыя электрастанцыі т. Бароўскі і фабрыкі «Комунарка» т. Губінскі рыхтуюцца да пушкінскіх дзён.

Чытальню навуковых работнікаў наведалі 54 чалавекі. Тут працаваў акадэмік т. Пратасеня над тэмай «Соцыялізм і сям'я».

Праведзена пяць кансультацый па фізіка-матэматычных навуках з рабочымі. Выдана 100 даведак, праведзены 2 гутаркі ў цэхах завода імя Кірава па самаадукацыі. Прысутнічала 150 чалавек. Выпісана 250 паведамленняў чытачам аб маючай адбыцца лекцыі.

Па хатняму абанементу 48 чытачоў атрымалі на дом 66 кніг. Рабочым і калгаснікам адпраўлена індывідуальна 20 пасылак з кнігамі па міжбібліятэчнаму абанементу.

КІРПІЧ.

***

Бібліятэку імя Пушкіна за адзін дзень наведала звыш 1000 чалавек. Бібліятэка ўсяго мае 6000 абанентаў. Гэта рабочыя, навуковыя работнікі, студэнты, школьнікі. Асабліва прыцягвае ўвагу чытачоў выстаўка аб жыцці вялікага паэта Расіі Аляксандра Пушкіна. Арганізован спецыяльны пушкінскі аддзел і кансультацыі аб творчасці паэта.

В. РАЙНЕС.